# «Выкарыстанне 3D-мадэлявання для гістарычных даследаванняў: узнаўленне страчаных архітэктурных аб'ектаў, стварэнне бюстаў гістарычных асоб»



**Праектная работа навучэнцаў**
**ДУА“Сярэдняя школа № 28 ім. В. Д. Сакалоўскага г. Гродна”**
**на аснове архіўных дакументаў НГАБ у г. Гродна**
**для XVII абласнога конкурсу (канферэнцыі) даследчых работ навучэнцаў**
**«Крыштальная Альфа – 2025»**

У красавіку 2025 года ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна навучэнцы ДУА “Сярэдняя школа № 28 ім. В. Д. Сакалоўскага г. Гродна” Савіцкі Арсеній і Самуськоў Міхаіл пад кіраўніцтвам работнікаў архіва праводзілі даследчую працу , якая стала часткай праекта для XVII абласнога конкурсу (канферэнцыі) даследчых работ навучэнцаў «Крыштальная Альфа – 2025».





Аб’ектам архіўнага даследавання стаў храм Фара Вітаўта, пасля Сафійскі сабор, які быў знесены ў 1961 годзе.

Даследаванне пачалося са знаёмства са структурай і правіламі архіва, рэгістрацыі ў чытальнай зале, што дазволіла навучэнцам атрымаць доступ да неабходных матэрыялаў. Пасля чаго яны вучыліся карыстацца пошукава-інфармацыйнымі сістэмамі і даведнікамі для падбору дакументаў.

# праца ў чытальнай зале

# праца з дакументамі




У наступныя дні перад даследчыкамі стаяла складаная задача — знайсці гістарычныя звесткі, якія тычацца архітэктурнага аблічча храма і яго знешняга выгляду. Для выканання гэтай працы яны ўважліва вывучылі ўсе наяўныя чарцяжы і каштарысы, што дазволіла ім атрымаць падрабязнае ўяўленне аб праекце і яго асаблівасцях.



# Сафійскі сабор на старонках дакументаў НГАБ у г. Гродна










Планъ
Софійскаго Собора въ городѣ Гроднѣ съ показа-
ніемъ перестройки.
А.
Б.
В.


Эскизъ на перестройку Софійскаго
Собора въ городѣ Гроднѣ.
Фасадъ по А.Б.
Разрѣзъ по В.Г.

# Праца з навукова-даведачнай бібліятэкай архіва

**Акрамя дакументаў навучэнцам былі прадстаўлены выданні, якія захоўваюцца ў навукова-даведачнай бібліятэцы архіва.**






# Стварэнне 3D-мадэлі

Далей выкарыстоўвалася праграма для 3D-мадэлявання Blender. Blender – папулярная свабодная праграмма для 3D і праектавання трохмерных аб’ектаў.








Атрыманая 3D-мадэль Сафійскага сабора дазваляе разгледзець храм з усіх бакоў, пазнаёміцца з яго архітэктурай. Такі віртуальны агляд робіць працэс даследавання больш наглядным і даступным, а таксама садзейнічае лепшаму ўспрыманню гістарычнага і культурнага значэння сабора. Праект навучэнцаў быў высока ацэнены – ён заняў другое месца ў абласным конкурсе. А Арсеній і Міхаіл атрымалі неацэнны вопыт працы ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна.





